# КОНКУРС ПРЫГАЖОСЦІ І ТАЛЕНТУ




Як звычайна, у сакавіку ў інтэрнаце № 3 прайшоў конкурс прыгажосці і таленту «Міс Вясна-2017», у якім прынялі ўдзел сямёра дзяўчат з розных факультэтаў. Вядоўцам вечара стаў студэнт 5 курса БФ Глеб Куляшоў, старшыня студэнцкага савета інтэрната.

Пачалося мерапрыемства з традыцыйнага дэфіле, бліжэй жа пазнаёміцца з удзельніцамі конкурсу гледачы і члены журы змаглі падчас «Візітоўкі». Дзяўчаты асацыявалі сябе з кветкамі і расказвалі пра свае захапленні, сям'ю, студэнцкія будні.

У інтэлектуальным конкурсе ўдзельніцам задавалі пытанні, на якія неабходна было даць арыгінальны адказ, а ў творчым – студэнткі чыталі вершы, спявалі, танчылі. Больш за ўсё (мяркуючы па рэакцыі прысутных) гледачам спадабаўся нумар Вікторыі Правілавай, якая за некалькі хвілін намалявала партрэт Мэрылін Манро.

У той час, калі члены журы выйшлі з залы, каб падвесці вынікі конкурсу, перад прысутнымі выступіў студэнт 2 курса ГФ Уладзіслаў Улаховіч, які прачытаў вершы вядомых беларускіх паэтаў, а таксама ўласныя творы.

І вось нарэшце доўгачаканы момант – узнагароджанне прыгажунь. У намінацыі «Міс Сімпатыя» (па выніках інтэрнэт-галасавання) перамагла студэнтка 1 курса БФ Ірына Юшчанка; у намінацыі «Міс Арыгінальнасць» – першакурсніца МГФ Вікторыя Правілава; у намінацыі «Міс Пяшчотнасць» – студэнтка 1 курса БФ Наталля Шэршнявая; у намінацыі «Міс Адкрыццё» – першакурсніца ФлФ Яўгенія Пудава; у намінацыі «Міс Драйв» – студэнтка 2 курса БФ Валерыя Рамушэвіч; у намінацыі «Міс Экстравагантнасць» – першакурсніца ГФ Аляксандра Лях.

А вядоўца вечара прыдумаў сваю намінацыю – «Міс Глебава сімпатыя» – і вызначыў пераможцу. Ёй стала Вікторыя Правілава.

На маю думку, усе канкурсанткі былі вартыя тытула «Міс Вясна-2017». Але пераможцай была названа студэнтка 1 курса БФ Аліна Зуева, якая стала і ўладальніцай тытула «Міс Стыль».

У гэты дзень перад гледачамі таксама выступілі студэнткі 1 курса ГФ Анастасія Лісоўская і Анастасія Несмяянава, якія выканалі прыгожы танец.

**Ірына МІКУЦКАЯ,**
**студэнтка 3 курса ФлФ.**
**Фота В. САЗОНАВАЙ,**
**студэнткі 2 курса БФ.**